Падтрымай "Вясну" на PATREON

Паўтара года "хатняй хіміі" атрымаў жыхар Мінскага раёна за абразу баранавіцкага міліцыянта

03.06.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



суд Мінскага раёна.

У судзе Мінскага раёна была разгледжана крымінальная справа ў дачыненні да жыхара пасёлка Сосны, кіроўцы таксі Сяргея Шарына, абвінавачанага ў абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 Крымінальнага кодэксу). Справу разглядала суддзя Анжаліка Казлова. Шарын абараняў сябе сам, без адваката.

Згодна з абвінавачваннем, 25 лістапада мінулага года **Сяргей Шарын** наўмысна публічна абразіў маёра міліцыі, намесніка начальніка крымінальнага вышуку Баранавіцкага РАУС **Ігара Ярохіна,** размясціўшы ў чаце “Карнікі Беларусі” пад яго фотаздымкам каментар “Мразота”. Публікацыя ў чаце датычылася таго, што Ярохін прымаў удзел у жорсткіх затрыманнях мірных пратэстоўцаў.

За гэты каментар Шарына затрымалі першага сакавіка і адпусцілі пад падпіску аб нявыездзе праз 72 гадзіны. У суд ён прыйшоў па позве.


Пацярпелы Ярохін на судзе не прысутнічаў у сувязі з непрацаздольнасцю, але ён пацвердзіў свой пазоў на кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 3000 рублёў.

Сяргей Шарын на судзе цалкам прызнаў віну. Падчас следства ён казаў, што яго тэлефон маглі выкарыстаць іншыя працаўнікі завода ў вёсцы Сціклева, дзе ён раней працаваў. Некалькіх супрацоўнікаў гэтага завода падчас следства выклікалі на допыты. На судзе Шарын патлумачыў, што даў такія паказанні, бо хацеў пазбегнуць адказнасці, і параіла яму гэта рабіць дзяржаўная адвакатка.


Пракурор запрасіў для Шарына паўтара года абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову, але суддзя Казлова вынесла больш мяккі прысуд: **1 год і 6 месяцаў абмежавання волі без накіравання** ў папаўчую ўстанову адкрытага тыпу (“хатняя хімія”). Таксама Шарын мусіць выплаціць пацярпеламу Ярохіну 1000 рублёў у якасці кампенсацыі маральнай шкоды. Суд канфіскаваў мабільны тэлефон асуджанага як сродак здзяйснення злачынства.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску


"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"









АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі" – акцыя вясноўцаў у Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Грамадзяніна Польшчы асудзілі ў Беларусі за "агентурную дзейнасць"

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ

‹ ›



Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY